**МІЖСАСЛОЎНАЯ КАМУНІКАЦЫЯ Ў ДВАРАНСКІМ МАЁНТКУ (к. XVIII – 1-ая пал. XIX стст.)**

***С. А. ШЫДЛОЎСКІ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт***
*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт*
*г. Наваполацк, Рэспубліка Беларусь*

Дваранскія сядзібы Беларусі к. XVIII – першай паловы XIX стст. з'яўляліся «лакальнымі сталіцамі», вакол якіх гуртаваліся жыхары прыналежных маёнтку мястэчак і вёсак, а таксама навакольных дробнашляхецкіх засценкаў. Да супольнасці маёнтка адносіліся таксама арандары панскіх зямель, мясцовы карчмар (апошні часта выконваў ролю фактара — райцы па эканамічных пытаннях) і святар [1, s. 59].

Саслоўную структуру супольнасці двара ўтваралі дваране, сяляне, мяшчане. Дробная шляхта ў 1831 – 1868 гг. прыпісвалася, як правіла, да катэгорыі аднадворцаў. Прадстаўнікі дробнага шляхецтва арандавалі землі памешчыка, батрачылі або працавалі на разнастайных пасадах у маёнтку. Акрамя таго прадстаўнікі дробнай шляхты разам з сялянамі выконвалі часам абавязкі чэлядзі, наймаліся працаваць да памешчыкаў на сенакосах і жніве.

Ад сялян прадстаўнікі дробнай шляхты адрозніваліся наяўнасцю саслоўнай самасвядомасці, а таксама асобных дэталяў побыту, якія служылі маркерамі «прывілеяванага» сацыяльнага статусу. Напрыклад, жанчыны-шляхцянкі не ўжывалі тканін з вышыўкай, як у народным строі; упрыгожванні выбіралі таксама адрозныя ад сялянскіх; палескія шляхціцы падвязвала лапці раменьчыкамі, а не вяроўкамі, як сяляне. Дробная шляхта пазбягала падабенства з ладам жыцця і звычаямі сялянства і капіравала паводле свайго разумення панскія манеры. Насілі прадстаўнікі шляхецтва шэры або чорны кафтан падобны да даўгога сурдута, такога ж колеру картуз, бараду галілі. Аднак шляхта ўсё ж ведала і раздзяляла сялянскія павер'і і забабоны, хоць, як правіла, не захоўвала фальклорную традыцыю, згадкі аб мінулым ці мясцовыя легенды. Светапогляд дробнай шляхты складаўся з эклектычных уяўленняў, якія яны называлі «веданнем свету» [2, с. 600−602; 3, s. 47−48; 4, s. 218, 221].

У буйных памешчыкаў на дворскіх пасадах знаходзіліся прадстаўнікі заможных родаў. Так, маршалак, які ажыццяўляў кіраванне гаспадаркай двара, пажадана мусіў займаць таксама дзяржаўную адміністратыўную пасаду. Аднак лоўчымі, а таксама канюшымі і падканюшымі прызначаліся звычайна найбольш заслужаныя стральцы і старэйшыя конюхі, што дазваляла чалавеку нязнатнаму зрабіць на гэтых пасадах кар'еру. Да высокіх адміністратыўных пасад двара адносіліся таксама сакратары (адказвалі за перапіску і архіў пана), падскарбіі (фінансы), шатныя ці камердынеры (адказвалі за гардэроб). Аднымі з найбольш блізкіх да пана персон двара былі блазны ці дзівакі. У маёнтках дробных памешчыкаў дворскія пасады былі нешматлікімі і іх маглі займаць прыгонныя, якія за сваю службу мелі агарод. Памешчыкі з меркаванняў прэстыжу, здаралася, апраналі іх у шляхецкія строі [5, с. 137; 6, с. 43; 7, с. 32−33; 8, s. 205−209; 9, s. 66; 10, s. 73, 78, 281; 11, s. 107, 110].

Л. Галамбёўскі вылучыў дзве катэгорыі афіцыялістаў (служачых): дворцаў ці дворскіх (слуг шляхецкага паходжання на дварах небагатых паноў) і дваран (шляхціцаў-слуг — рэспектовых або аплатных — на вялікапанскіх дварах) [8, s. 206−207]. З. Глогер апісаў тры групы: 1) дваран-чыноўнікаў (маршалкі, сакратары, канюшыя, падскарбіі, піўнічыя, шатныя, падчашыя); 2) рэспектовых дваран (дзеці заможных памешчыкаў), якія мелі ад пана толькі фураж для коней і сталаванне для аднаго-двух сваіх пахолкаў; 3) дваран-служачых з беднай шляхты, якія служылі за аплату, атрымлівалі фураж і «барву» ад пана, мелі права на скарбовае ўтрыманне пахолка і служкі [9, s. 66].

Аплата афіцыялістаў залежала ад пасады, напрыклад, «падвойны дваранін», які служыў з двума канямі і адным пахолкам, зарабляў прыкладна ў два разы больш, чым «паедынчы дворскі», які служыў з адным канём. Акрамя грошай аплатныя дваране забяспечваліся вопраткай, сядлом, зброяй, фуражом. Аднак кожны адданы свайму пану афіцыяліст мог спадзявацца на большае. За сумленную службу, вернасць сваім палітычным і эканамічным інтарэсам памешчык аддаваў у арэнду фальваркі за памяркоўную цану, складаў пратэкцыю для далейшай кар'еры афіцыяліста, выплачваў пажыццёвую пенсію, выгодна жаніў. Усё сямейства афіцыяліста падпадала пад апеку больш магутнага панскага роду [2, с. 600−606; 12, с. 50; 9, s. 65−66; 8, s. 221, 223]

Такім чынам, соцыум дваранскага памешчыцкага маёнтку на беларускіх землях у канцы XVIII – першай палове XIX стст. меў складаную арганізацыю з шматузроўневай сістэмай стратыфікацыі. Насельніцтва памешчыцкіх двароў складалася з трох галоўных груп: сям'і памешчыка, афіцыялістаў і чэлядзі. Найбольш разгалінаваную ўнутраную дыферэнцыяцыю мела група афіцыялістаў (служачых). Саслоўную структуру супольнасці двара ўтваралі дваране, сяляне, мяшчане. Дробная шляхта ў 1831 – 1868 гг. прыпісвалася, як правіла, да катэгорыі аднадворцаў. Міжсаслоўная камунікацыя ў дваранскім маёнтку на беларускіх землях паміж прадстаўнікамі розных сацыяльных груп насіла характар іерархічнага супадпарадкавання. Найбольш каштоўным сацыяльным рэсурсам на панскім двары з’яўляліся асабістыя адносіны члена дваровай супольнасці з гаспадаром маёнтку, што дазваляла захоўваць магчымасць сацыяльнай мабільнасці ўнутры дадзенай супольнасці нават для прадстаўнікоў непрывілеяванага саслоўя.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Zajączkowski, A. Szlachta polska : Kultura i struktura / A. Zajączkowski. — Warszawa : Semper, 1993. — 116 s.
2. Опыт описания Могилёвской Губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях : В 3 книгах. Кн. 1 / Под ред. А. С. Дембовецкого. — Могилёв : Типография губернского правления, 1882. — [6], 782, [2] с.
3. Kraszewski, J. I. Wspomnienia Polesia, Wołynia i Litwy / J. I. Kraszewski. — Paryż : Nakładem J. K. Wilczynskiego, 1860. — 144 s.
4. Tyszkiewicz, K. Wilija i jej brzegi : pod względem hydrograficznym, historycznym, archeologicznym i etnograficznym / K. Tyszkiewicz. — Drezno : drukiem i nakładem Józefa I. Kraszewskiego, 1871. — XVI, 362 s.
5. Масальскі, Э. Т. З успамінаў (1799–1824) / Э. Т. Масальскі ; пер. з польск. С. А. Шыдлоўскага // Маладосць. — 2014. — № 6. — С. 127–138.
6. Охотский, Я. Д. Рассказы о польской старине. Записки XVIII века / Я.Д. Охотский ; подг. Ю. Крашевского ; пер. с пол. Н.С.П. — СПб. : Тип. П.П. Меркульева, 1874. — 319 с.
7. Патоцкі, Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану / Л. Патоцкі ; пер. з пол. І. У. Саламевіча. — Мінск : Полымя, 1997. — 270 с.
8. Gołębiowski, Ł. Domy i dwory / Ł. Gołębiowski. — Warszawa : Druk. N. Gkücksberga, 1830. — [4], 296 s.
9. Gloger, Z. Encyklopedja staropolska : w 4 t. / Z. Gloger. — Warszawa : Druk P. Laskauera i W. Babickiego, 1900–1903. — T. 2. — 1901.— 332 s.
10. Gloger, Z. Encyklopedja staropolska : w 4 t. / Z. Gloger. — Warszawa : Druk P. Laskauera i W. Babickiego, 1900–1903. — T. 3. — 1902.— 350 s.
11. Kitowicz, A. Opis obyczajów i zwyczajów za panowania Augusta III : w 4 t. / A. Kitowicz. — Poznań : W drukarni Walentego Stefańskiego, 1840−1841. — T. 3. — 1840. — [4], 227 s.
12. Шыдлоўскі, С. А. Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі : 1795−1864 гг. / С. А. Шыдлоўскі. — Мінск : Беларуская навука, 2011. — 168 с.